ды бравага салдата Швейка» паводле Гашака (Ан.Ляляўскі, Фаміна); «Гадзіннік з зязюляй» С.Пракоф'евай (Казлова, Герлаван). **1982** — «Доктар Айбаліт» і «Чортаў млын» (Казлова, Герлаван), «Сымон-музыка» У.Ганчарова і В.Мазынскага паводле Я.Коласа (Ан.Ляляўскі, Фаміна). **1983** — «38 папугаяў» Р.Остэра і «Чароўная лямпа Аладзіна» (Ан.Ляляўскі, Фаміна), «Хачу быць Богам, або Спакушэнне Гефеста» Вярцінскага (Казлова, Герлаван). **1984** — «Балада пра белую вішню» Клімковіч (Ан.Ляляўскі, Герлаван), «Жаваранак» Ж.Ануя (Ан.Ляляўскі, Фаміна), «Казка пра цара Салтана» паводле Пушкіна (Ан.Ляляўскі, В.Рачкоўскі). **1985** — «Прыгоды шэвалье Д'Артаньяна» У.Алейнікава паводле А.Дзюма-бацькі (Ан.Ляляўскі, Фаміна), «Церам-церамок» Маршака (Ю.Сарычаў, Рачкоўскі). **1986** — «Чырвоная шапачка» Шварца (Ан.Ляляўскі, Фаміна), «Граф Глінскі-Папялінскі» А.Вольскага (Ал.Ляляўскі, Рачкоўскі), «Дзед і Жораў» В.Вольскага (Ал.Ляляўскі, А.Ганіёдская). **1987** — «Казка пра Хлапчыша-Кібальчыша» паводле Гайдара (Сарычаў, Рачкоўскі), «Прывітанне мартышцы» Остэра (Ал.Ляляўскі, Фаміна і Рачкоўскі), «Майстар і Маргарыта» паводле Булгакава (Ал.Ляляўскі, Фаміна). **1988** — «Здарэнне ў горадзе Гога» С.Грума (Э.Маярон, М.Сімчыч), «Пра Фядота-стральца, удалога малайца» Л.Філатава (Сарычаў, Ганіёдская), «Тры парасяці» С.Міхалкова (Ал.Ляляўскі, А.Вахрамееў). **1989** — «Тое самае сланяня...» Уладычынай паводле Кіплінга (А.Жугжда, Вахрамееў). **1990** — «Бура» Шэкспіра і «Сымон-музыка» В.Вольскага паводле Я.Коласа (Ал.Ляляўскі, Фаміна), «Васіліса Прыгожая» Пракоф'евай і Сапгіра (Сарычаў, Ганіёдская). **1991** — «Прыгоды Бураціна ў краіне Дурняў» А.Шапіры паводле А.Талстога (Ал.Ляляўскі, Вахрамееў), «Мышаня Мыцык» Я.Чапавецкага (І.Мацкевіч, Вахрамееў), «Папялушка, ці Свята дабрачыннасці» Маснэ (Ал.Ляляўскі, Фаміна і Вахрамееў). **1992** — «Чароўная кашуля» В.Маслюка (Маслюк, Рачкоўскі). **1993** — «Румі і стары леў» Й.Радзічкава (Мацкевіч, Герлаван); «Цар Ірад» («Прывіды калядныя ночы») Барышава (Ал.Ляляўскі, Фаміна). **1994** — «Банжур, месье Перо!» Н.Слепаковай (Ал.Ляляўскі, Фаміна), «Кацяня Гаў» Остэра (Ал.Ляляўскі, Фаміна). **1995** — «Алі-Баба і разбойнікі» У.Маслава (М.Андрэеў, Ю.Давыдзюк). **1996** — «Прыгоды алавянага салдаціка, пастушкі і камінара» Жугжды паводле Андэрсена (Жугжда, Рачкоўскі), «Казка пра рыбака і рыбку» А.Пушкіна (рэж. і маст. Д.Малінін, Д.Саладуха), «Гісторыя Снежнай каралевы, расказаная ёю самой» Ал.Ляляўскага паводле Андэрсена (Ал.Ляляўскі, Фаміна). **1997** — «Чараўнік Ізумруднага горада» паводле А.Волкава (В.Растрыжэнкаў, Рачкоўскі); «Гэта ты, Моцарт?!» І.Мацкевіч (Мацкевіч, А.Ігруша). **1998** — «Русалачка» Жугжды паводле Андэрсена (Жугжда, Л.Скітовіч). **1999** — «Ганэле» Гаўптмана (Ал.Ляляўскі, Фаміна), «Вясёлы цырк» Ан.Ляляўскага (Ал.Ляляўскі, У.Кандрусевіч-малодшы), «Кот у ботах» Уладычынай (У.Грамовіч, Рачкоўскі і Фаміна). **2000** — «Усе мышы любяць сыр» Д.Урбана (Ал.Ляляўскі, Т.Нерсісян).

*Літ.:* Каладзінскі М.А. Тэатр лялек Савецкай Беларусі. Мн., 1976.

*М.А.Каладзінскі, С.Ф.Юркевіч.*

**БЕЛАРУ́СКІ ДЗЯРЖА́ЎНЫ УНІВЕРСІТЭ́Т КУЛЬТУ́РЫ** Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Заснаваны ў 1975 як Мінскі ін-т культуры на базе ф-таў культ.-асв. работы Бел. тэатр.-маст. ін-та і бібліятэказнаўства і бібліяграфіі Мінскага пед. ін-та. У 1993 пераўтвораны ў Бел. ун-т культуры, з 2001 сучасная назва. Рэктары А.Петрашкевіч (1975—76), Н.Пашкевіч (1976—79), В.Пузікаў (1979—87), М.Заранок (1988—92), Я.Грыгаровіч (з 1992). На ф-тах бібліятэчна-інфарм. сістэм, культуралогіі, маст. творчасці навучаюцца спецыялісты розных профіляў культуры і мастацтва, у т.л. тэатр. мастацтва. На кафедры тэатр. творчасці (спачатку рэжысуры і майстэрства акцёра) вядзецца падрыхтоўка ў галіне тэатр. творчасці, рэжысуры фалькл. тэатра, акцёрскага майстэрства і літ. работы (спецыялізацыі: драматургія, кіна-, тэле- і радыёдраматургія). Рыхтуюцца рэжысёры і кіраўнікі драм. і фалькл. калектываў, арганізатары тэатр. творчасці, выкладчыкі сцэн. мастацтва, акцёры драм. тэатра і кіно, кіна- і тэлерадыёсцэнарысты, драматургі і інш. Арганізатар і першы кіраўнік кафедры рэж. І.Папоў. У розныя гады кафедрай загадвалі Б.Эрын, Ю.Сохар, А.Лабовіч, А.Сабалеўскі, з 2001 — Л.Голікава. Выкладанне тэатр. і інш. дысцыплін вялі В.Тарасаў, Л.Давідовіч, В.Лебедзеў, А.Качаткова-Васільева, Т.Мархель, В.Саркісьян, В.Цюпа, А.Дудараў, Г.Барышаў, А.Саннікаў і інш. Працуюць (2001): Н.Загорская, А.Бутакоў, М.Абрамаў, Л.Старадумава, В.Анісенка, Петрашкевіч, М.Захарэвіч, В.Мазынскі, Т.Нікалаева, Сабалеўскі і інш. Педагогі даследуюць праблемы развіцця бел. сцэн. мастацтва і драматургіі, распрацоўваюць методыку выкладання тэатр. дысцыплін.

**БЕЛАРУ́СКІ ДЗЯРЖА́ЎНЫ ХАРЭАГРАФІ́ЧНЫ КАЛЕ́ДЖ.** Засн. ў Мінску ў 1945 як Бел. дзярж. харэаграфічнае вучылішча, з 1992 — Дзярж. харэаграфічнае вучылішча

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ